Ерашэвіч Аляксандр
УА «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт», Мінск, Беларусь

Yerashevich Aliaksandr
Belarus state economic university, Minsk, Belarus

УДК [94(476)+336.02(476)(091)]«17»

БЕЛАРУСКІЯ ГУБЕРНІ Ў СІСТЭМЕ АГУЛЬНАДЗЯРЖАЎНАГА БЮДЖЭТУ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ Ў 1770–1790-Я ГАДЫ

THE BELARUS PROVINCES IN SYSTEM OF THE NATION-WIDE BUDGET OF THE RUSSIAN EMPIRE IN THE 1770–1790

Артыкул прысвечаны праблеме вызначэння месца беларускіх губерняў, якія ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў увайшлі ў склад Расійскай імперыі, у агульнадзяржаўным бюджэце гэтай дзяржавы ў 70–90-я гады XVIII стагоддзя. Каштоўнасць змешчаных у артыкуле звестак, а таксама навуковая абгрунтаванасць асноўных высноў даследавання заснаваны на выкарыстанні аўтарам шырокага комплексу як апублікаваных статыстычных матэрыялаў, так і неапублікаваных дакументаў з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Мінску. У артыкуле аўтар упершыню ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі паспрабаваў вызначыць месца беларускіх земляў у сістэме агульнарасійскіх дзяржаўных даходаў, высветліць суадносіны паміж рэгіянальнымі бюджэтамі Полацкай і Магілёўскай губерняў і агульнадзяржаўным бюджэтам часоў царавання Кацярыны II, паказаць дынаміку змен памераў грашовых паступленняў, ацаніць уклад беларускіх губерняў у агульнаімперскую казну ў канцы XVIII стагоддзя.

Ключавыя словы: дзяржаўны бюджэт; Расійская імперыя; беларускія губерні; даходы; расходы; падаткі; грашовыя зборы.

The Belarus lands as a result of the sections Polish-Lithuanian Commonwealth of Both Nations were included in the Russian Empire. The article is devoted to the problem of determining the place of the Belarus provinces in the nation-wide budget of this state in 1770–1790 th. The value of the information and the scientific validity of the basic conclusions of research is based on the use of the author of a wide complex both the published statistical materials and the unpublished documents from National Historical Archive of Belarus in Minsk. For the first time in a modern Belarus historiography the author has made an attempt to determine the place of the Belarus lands in system of the Russian public revenues in this article. The author has tried to find out a parity between regional budgets of Polotsk and Mogilev provinces and the nation-wide budget of Russian Empire during the reign of Catherine 2. The paper shows the dynamics of changes in the sizes of monetary receipts and estimated the contribution of the Belarus provinces in Russian treasury in the end of XVIII century.

Keywords: state budget; Russian empire; Belarus provinces; incomes; expenses; taxes; monetary gathering.

Адной з недастаткова і маладаследаваных праблем айчыннай гісторыі з'яўляецца пытанне аб месцы і ролі земляў Беларусі ў фарміраванні агульнадзяржаўнага бюджэту Расійскай імперыі ў канцы XVIII – пачатку XX стагоддзя. Відавочна, што паэтапнае ўваходжанне беларускіх земляў у выніку падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795 гадоў) у склад цэнтралізаванай манархічнай дзяржавы паўплывала на некаторае павелічэнне дзяржаўных даходаў Расійскай імперыі за кошт нованабытых тэрыторый і насельніцтва.

Пэўны матэрыял аб развіцці фінансавых і падатковых інстытутаў Расійскай імперыі ў 70–90-я гады XVIII стагоддзя ўвогуле без вылучэння асобных тэрытарыяльных рэгіёнаў утрымліваецца ў працах дасавецкіх расійскіх даследчыкаў: дзяржаўнага дзеяча, былога члена і старшыні Дзяржаўнага савета Расійскай імперыі, гісторыка Анатоля Мікалаевіча Куламзіна (1838–1923) [6], археографа і калекцыянера Мікалая Дзмітрыевіча Чачуліна (1863–1927) [11] і іншых гісторыкаў [2, с. 594–630; 8, с. 757–772], якія вывучалі пытанні стану грашовай сістэмы, знешняга гандлю, дзяржаўных фінансаў Расійскай імперыі ў часы кіравання «паўночнай Семіраміды».

Сярод сучасных беларускіх даследчыкаў найбольш плённа змены ў сацыяльна-эканамічным і палітычным становішчы Беларусі ў эпоху Кацярыны II вывучае Я. К. Анішчанка. У апошняй буйной працы вучонага па дадзенай праблематыцы [1] упершыню ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі сістэмна і рознабакова на шырокай крыніцазнаўчай базе даследаваны працэс далучэння і паступовай інтэграцыі ўсходнебеларускіх зямель да Расійскай імперыі ў 1772–1796 гады, разгледжаны некаторыя напрамкі ўрадавай палітыкі па насаджэнні на нованабытых тэрыторыях рускага заканадаўства, прааналізаваны змены ў судаводстве, тэрытарыяльна-адміністрацыйным дзяленні, адміністрацыйнай сістэме, вызначаны формы і метады, ступень рэалізацыі царызмам палітыкі ў некаторых сферах жыццядзейнасці грамадства (аграрнай, канфесіянальнай, гандлёвай, мытнай, кіраўнічай). Аднак па-за ўвагай гісторыка засталіся пытанні, звязаныя з распаўсюджваннем на ўсходнебеларускія землі агульнаімперскіх інстытутаў дзяржаўных фінансаў.

Мэта артыкула – вызначыць месца беларускіх земляў у сістэме агульнарасійскіх дзяржаўных даходаў, высветліць суадносіны паміж мясцовым і агульнаімперскім бюджэтамі часоў царавання Кацярыны II у Полацкім і Магілёўскім намесніцтвах (т. зв. беларускіх губернях) пераважна ў 80–90-я гады XVIII стагоддзя.

Аснову крыніцавай базы артыкула склалі апублікаваныя матэрыялы дзяржаўных роспісаў дзяржаўных даходаў і расходаў Расійскай імперыі

[4; 5], сістэматычны пачатак складання якіх у пагубернскім разрэзе ў межах усёй дзяржавы адносіцца верагодна да 1780 года.

Заўважым, што раздробленасць фінансавага кіравання, адсутнасць наладжанага справаводства і заблытанасць уліку, імкненне чыноўнікаў схаваць крадзёж казённых сродкаў, нявызначанасць прамых і ўскосных, акладных і неакладных падаткаў прыводзяць да пэўнай непаўнаты і супярэчлівасці звестак, неабходных для вызначэння крыніц і структуры губернскіх бюджэтаў, памераў, прынцыпу, характару і парадку спагнання грашовых збораў. Наступная перспектыўная, але складаная задача, – высвятленне ступені непаўнаты даных афіцыйна-справаводных дакументаў, для чаго неабходны супастаўленне розных крыніц даходаў у бюджэце (падушнага падатку, салянога збору і інш.), перакрыжаваны аналіз звестак мясцовых і цэнтральных фінансава-падатковых органаў.

Змены ў структуры, крыніцах і памерах даходнай часткі бюджэту Расійскай імперыі другой паловы XVIII стагоддзя адбываліся пад уплывам розных фактараў: абумоўліваліся характарам эканамічнай і сацыяльнай палітыкі ўрада, курсам знешняй палітыкі самадзяржаўя ў сувязі з выпрацоўкай, падрыхтоўкай і рэалізацыяй ваенна-стратэгічных планаў царызму; залежалі ад тэмпаў эканамічнага развіцця (прамысловасці, рамяства, сялянскіх промыслаў, унутранага і знешняга гандлю, ступені ўцягвання сельскай гаспадаркі ў таварна-грашовыя адносіны, росту таварызацыі памешчыцкай і сялянскай гаспадаркі і г. д.), павелічэння прамых і ўскосных падаткаў і збораў, выкарыстання магчымасцей манетнай рэгаліі дзяржавы (масавы выпуск папяровых асігнацый), развіцця ўвогуле дзяржаўных фінансава-крэдытных інстытутаў; былі звязаны з пашырэннем тэрыторыі і ростам насельніцтва дзяржавы, асабліва падатных станаў; вызначаліся іншымі абставінамі.

Першы беларускі генерал-губернатар З. Р. Чарнышоў у ведамасці ад 1.06.1773 года вылічыў дзяржаўны гадавы даход у беларускіх губернях наступным чынам: 439714,9 руб. пагалоўных падаткаў з купцоў, сялян і яўрэяў і 142133,6 руб. піцейных збораў, разам 581848,5 руб. Выключаючы пастаўляемы сялянамі ў правіянцкія магазіны хлеб 68906 чвэрцяў і 6 чацвярыкоў (коштам за чацвярык мукі па 15 кап., разам па цане на 82688,35 руб.), атрымлівалася грашыма 499160,15 руб. Паколькі дзяржаўныя даходы збіраліся за палову года, таму ў 1773 годзе прыбыткаў у «новых правінцыях, далучаных ад Польшчы» меркавалася сабраць 290924,25 руб. (249580,07 ½ руб. грашыма і 41344,17 ½ руб. хлебам па штатнай цане) [3, т. 1. № 3, с. 371, 373–374, т. 5, с. 227]. У пачатку 1774 года беларускі генерал-губернатар падаў у Сенат ведамасці аб даходах, сабраных у Пскоўскай і Магілёўскай губернях на другую палову 1773 года (табліца 1) (падлічана па: [10]).

Такім чынам, у структуры грашовых паступленняў тэрыторый, якія былі ўключаны ў склад Расійскай імперыі пасля першага падзелу Рэчы

Паспалітай, асноўнае месца займалі прамыя асабістыя падаткі: падушны падатак (30,3 %), даходы з дзяржаўнай уласнасці (18,4 %), збор за права вінакурэння (13,6 %), мэтавы паштовы збор (7,6 %), а таксама мытны і саляны прыбыткі (21,6 %). Неабходна таксама адзначыць, што частка грашовых збораў з прычыны неплацежаздольнасці большай часткі вясковага насельніцтва была заменена натуральнымі зборамі. У Галоўны Крыгс-камісарыят з беларускіх губерняў закуплялі хлеб па штатнай цане.

Табліца 1

Каштарыс сабраных даходаў у Пскоўскай і Магілёўскай губернях на другую палову 1773 года, руб.

Найменне збораў	Пскоўская	Магілёўская	Разам	%
Пагалоўныя	82024,97 ½	92642,85	174667,82 ½	29,7
За вінны продаж	31307,1	48357,51	79664,61	13,6
Арэндныя з старостваў	4869	2018	6887	1,2
Памешчыцкі даход з дварцовых вёсак	5184	21522,5	26706,5	4,5
З старостваў у казённым ведамстве	28 888	45566,88 ½	74454,88 ½	12,7
Накладных пры пагалоўным зборы па 2 кап. з рубля	1640,5	1853,13 ¾	3493,63 ¾	0,6
Утрыманне паштаў	21735,22 ½	23027,88 ½	44763,11	7,6
Мытныя	21040,66 ¼	64202,01	85242,67 ¼	14,5
За праданую соль	10716,5	31133,15	41849,65	7,1
Неакладныя (пошлінаў крапасных, з чалабітных, за гербавую паперу, на шпіталь і медыкаменты)	686,07 ¾	5380,24 ½	6066,32 ¼	1
Хлеб па кошту 1,2 руб. за чвэрць	15 519 чвэрцяў	18 499 чвэрцяў	43223,02 ½	7,4
Разам			587019,23 ¾	100

Дасланыя ў 1777 годзе ведамасці Полацкай і Магілёўскай камерных экспедыцый даюць уяўленне аб паступленні галоўных збораў даходаў у беларускіх губернях за апошнія гады і пераразмеркаванні

грошай паміж асобнымі ведамствамі. У Полацкай губерні ў 1775, 1776, студзені 1777 года было сабрана 160 894 руб. пагалоўнага збору, 60 080 руб. збору за вінную сідку і вольны продаж. Пагалоўнага хлеба паступіла ў правіянцкія магазіны 29 292 чвэрцяў ці па штатнай цане па 1,2 руб. за чвэрць коштам на 35150,74 руб. Хлеб залічваўся ў ведамства Галоўнай Правіянцкай канцылярыі, аднак належныя сумы грошай былі пакінуты ў Галоўным Крыгс-камісарыяце для аддачы ў Статс-кантору, але грошай у экспедыцыю так і не было асігнавана. Сумы на расходы выдаткоўваліся паводле ўказаў устаноў. У Магілёўскай губерні ў 1775 і 1776 гадах было ўнесена 190697,73 ¾ руб. пагалоўных грошай, 82856,65 руб. вінных, паступіла 36 791 чвэрць правіянту на 44149,96 руб. Замест памянутых трох збораў з Камер-калегіі, Саляной канторы і Правіянцкай канцылярыі грошай не асігнавалася. Толькі ў 1776 і студзеньскай трэці 1777 года было выкарыстана ў пазыку на жалаванне і іншыя стацкія расходы 63260,67 руб. з салянога збору [9, л. 258–259]. Саляная кантора па абедзвюх губернях у 1776–1778 гадах выдзеліла толькі 108540,76 руб., зварот якіх патрабавала з Статс-канторы [9, л. 260]. Для дакладнасці падлікаў загадвалася даставіць ведамасці ў Камер-калегію, Галоўную саляную кантору і Крыгс-камісарыят.

Адзначым, што апублікаваныя А. М. Куламзіным генеральныя табелі пагубернскіх даходаў і выдаткаў сведчаць, што самыя значныя па велічыні паступленні грашовых даходаў (падушны збор і інш.) заўсёды ўключаліся ў агульнадзяржаўныя сметы даходаў. Асобна паказваліся так званыя іншыя дзяржаўныя зборы (піцейныя, мытныя, на ўтрыманне пошты і інш.). Адначасова некаторыя зборы засяроджваліся ў асобных ведамствах. Большае адзінства ў сметнай сістэме наступіла толькі з 1788 года, калі большая частка ведамасных збораў была пераведзена ў агульнадзяржаўныя даходы [4, с. 222]. У той жа час у бюджэтных каштарысах не ўлічваліся даходы асобных ведамстваў: натуральныя хлебныя зборы ведамства Правіянцкага дэпартамента ў астзейскіх і беларускіх губернях, прыбыткі з дварцовых маёнткаў, якія паступалі ў ведамства Прыдворнай і Канюшанай кантор, даходы паштовага ведамства і інш. [4, с. 223]. У цэлым табелі ўтрымліваюць каштарыс толькі звычайных крыніц дзяржаўных даходаў.

Пэўнае ўяўленне аб месцы беларускіх губерняў у сістэме агульнаімперскай даходнай часткі дзяржаўнага бюджэту ў 1781–1796 гадах даюць даныя табліцы 2 [4, с. 236–237, 241, 244, 248, 249, 254, 258–259, 262, 266–267, 272, 276–277, 280, 284–285, 288, 292–293; 5, с. 220, 222, 227, 230, 232, 237, 240, 242, 247, 248, 250, 255, 256, 258, 263, 264, 266, 271, 274, 276, 281, 284, 286, 291, 294, 296, 303].

У цэлым з 1781 па 1796 год грашовыя паступленні ў беларускіх губернях намінальна выраслі амаль у 2,2 раза, аднак трэба ўлічваць, што

Табліца 2

Дынаміка дзяржаўных даходаў Полацкай і Магілёўскай губерняў (1781–1796 гады)

Год	Магілёўская, руб.	Полацкая, руб.	Разам даходаў па беларускіх губернях, руб.	Адносны паказчык агульнаімперскіх даходаў, %	Адносны паказчык росту з 1781 г., %	Штогадовыя тэмпы (прырасту ці страт), %
1781	253567,36 ½	222358,33 ¼	475925,69 ¾	1,65	100	
1782	269805,01	214174,48 ¾	483979,49 ¾	1,60	101,7	+1,7
1783	274930,80 ½	222106,34 ½	497037,15	1,57	104,4	+2,7
1784	379739,60 ¾	273864,72	653604,32 ¾	1,61	137,3	+31,5
1785	414188,64 ¾	291643,05 ¼	705831,70	1,68	148,3	+8
1786	437355,47 ¾	315599,95	752955,42 ¾	1,83	158,2	+6,7
1787	473075,85	318577,81 ¼	791653,66 ¼	1,82	166,3	+5,1
1788	435483,56	322057,03	757540,59	1,80	159,2	-4,3
1789	464641,17 ½	337987,93 ½	802629,11	1,82	168,6	+5,9
1790	450806,37 ¼	355635,99	806442,36 ¼	1,81	169,4	+0,5
1791	369601,42	326662,65	696264,07	1,62	146,3	-13,7
1792	304059,65 ¾	293614,14 ¼	597673,8	1,37	125,6	-14,2
1793	308128,57 ½	304592,37 ½	612720,95	1,37	128,7	+2,5
1794	446915,2 ¾	323105,86 ¼	770021,07	1,36	161,8	+25,7
1795	537490,85	455139,03	992629,88	1,45	208,6	+28,9
1796	556009,31	473903,87 ¼	1029913,18 ¼	Больш 1,50	216,4	+3,7

асігнацыі за гэты ж час страцілі 30,8 % сваёй вартасці адносна сярэбранай манеты. Заўважым, што найбольшы прырост дзяржаўных даходаў назіраўся ў 1784–1786 і 1794–1795 гадах, а падзенне – у 1788 і 1791–1792 гадах (час войнаў Расійскай імперыі з Швецыяй, Асманскай імперыяй і Рэччу Паспалітай). Уклад беларускіх губерняў у валавы збор тэрытарыяльных рэгіёнаў у агульнаімперскую казну вагаўся ад 1,4 да 1,8 % агульнай колькасці грашовых дзяржаўных даходаў. Агулам, у Магілёўскай і Полацкай губернях у 80-я – сярэдзіне 90-х гадоў XVIII стагоддзя назіраўся паступовы, але не заўсёды лінейны, абсалютны рост падатковых збораў, а ў 1780-я гады і некаторае адноснае павелічэнне іх удзельнай вагі ў структуры агульнаімперскіх даходаў.

Зрэшты, у беларускіх губернях эфектыўнасць грашовых паступленняў была даволі высокай, і яны не вылучаліся сярод іншых у накапленні значнай колькасці нядоімкак, налікаў, недабораў і спагнанняў грашовых збораў, якія па Полацкай і Магілёўскай губернях складалі сярод 42 губерняў Расійскай імперыі к 1793 году 1,15 %, а к 1794 году – 2,06 % агульнаімперскіх [7, с. 408–413].

Частка сабраных даходаў пакідалася ў губернях для задавальнення мясцовых выдаткаў, другая – адсылалася ў Камісарыяцкае ведамства, трэцяя – паступала ў казначэйствы для статных сумаў. Астатнія неасігнаваныя сумы адсылаліся ў казначэйствы для рэшткавых сумаў для задавальнення ўсіх надзвычайных дзяржаўных расходаў [4, с. 221]. Да сярэдзіны 1780-х гадоў большая частка спагнаных дзяржаўных падаткаў і збораў беларускіх губерняў заставалася на месцы для задавальнення губернскіх расходаў (у 1782–1783 гадах нават нічога не адсылалася), аднак у час падрыхтоўкі і вядзення войнаў з Турцыяй і Швецыяй адлічэнні ў агульнадзяржаўнае казначэйства павялічваліся і дасягалі ў асобныя гады да трэці губернскіх даходаў.

Неабходна адзначыць, што ўклад Магілёўскай губерні ў агульнаімперскі скарб у 1780-я гады быў у цэлым больш значным, чым Полацкай. У апошнія гады царавання Кацярыны II (1795–1796 гады) пасля задушэння паўстання 1794 года і канчатковай ліквідацыі Рэчы Паспалітай як дзяржавы ва ўмовах падрыхтоўкі да магчымых ваенных дзеянняў супраць Прусіі Полацкая губерня накіроўвала ад 41 % (1795 год) да 52 % (1796 год), а Магілёўская – амаль палову сабраных даходаў (1796 год) (гл. табліцу 3) (падлічана па: [4, с. 236–237, 244, 254, 262, 272, 280, 288; 5, с. 222, 232, 242, 250, 258, 266, 276, 286, 296]). Іншымі словамі, назіралася тэндэнцыя да паступовага змяншэння сродкаў, якія заставаліся на месцы, што было звязана з павелічэннем ваенных выдаткаў Расійскай імперыі.

Апублікаваныя А. М. Куламзіным даныя генеральных бюджэтных роспісаў на 1781–1796 гады па губернях Расійскай імперыі дазваляюць прагледзець не толькі дынаміку размеркавання грашовых сродкаў

даходаў і расходаў у дзяржаве ў цэлым і паміж асобнымі губернямі ў прыватнасці, але і вызначыць уклад асобных губерняў і тэрытарыяльных рэгіёнаў у даходную частку агульнаімперскай дзяржаўнай казны (табліца 4) [4, с. 270–277; 5, с. 293–303].

Табліца 3

Размеркаванне даходаў Магілёўскай і Полацкай губерняў на розныя выдаткі (1781–1796 гады), %

Год	Магілёўская			Полацкая		
	1.	2.	3.	1.	2.	3.
1781	86,1	0,4	13,5	85,8	1,3	12,9
1782	89,1	10,9	0	88	12	0
1783	90,7	9,3	0	88,9	11,1	0
1784	81,9	12,7	5,4	82	8,4	9,6
1785	64,5	6,1	29,4	89,4	8	2,6
1786	59,2	5,8	35	76,3	7,4	16,3
1787	55,3	4,8	39,9	76	6,7	17,3
1788	43,3	25,3	31,4	53,6	23,6	22,8
1789	40,2	20,6	39,2	50,5	22,1	27,4
1790	40,3	13,9	45,8	48	16,3	35,7
1791	49	17	34	52,2	17,7	30,1
1792	59,8	20,7	19,5	58	19,9	22,1
1793	62,4	20,4	17,2	60,3	19,1	20,6
1794	73,6	14,1	12,3	61,8	18,1	20,1
1795	85,3	7,4	7,3	46,3	12,8	40,9
1796	43,3	6,8	49,9	40,3	7,9	51,8

1. На агульнагубернскія патрэбы.
2. Патрэбы ведамстваў.
3. Да беззваротнай адсылкі (у Санкт-Пецярбургскае штатнае казначэйства, Пецярбургскае для лішкавых сум казначэйства, Камісарыят, Адміралцейства, Пецярбургскае казначэйства дварцовых даходаў).

Калі дапусціць, што перавод грашовых сродкаў у цэнтральныя казначэйствы на агульнадзяржаўныя расходы залежаў ад памераў сабраных губернскіх даходаў, то, ведаючы суадносіны сумаў даходаў асобных губерній, можна заключыць, што бяднейшыя губерні ўносілі абмежаваную колькасць атрыманых даходаў у агульнадзяржаўны скарб. Паводле роспісу на 1781 год найбольшыя сумы даходаў мелі Пецярбургская, Табольская, Казанская, Маскоўская, Валагодская, Наўгародская,

Табліца 4

Класіфікацыя губерняў Расійскай імперыі па ўзроўню даходнай часткі бюджэту (1785, 1796 гады)

№	Губерня	1785 г., руб.	%	№ рэйтынгу	1796 г., руб.	%	№ рэйтынгу
1	Пецярбургская	5026226,7	13,16	1	6817796,17	11,93	1
	Пецярбургскія прысутныя ўстановы	501529,14			1372176,27		
2	Пермская	3039796,83	7,23	2	3193285,05	4,65	3
3	Маскоўская	2467098,28	6,12	3	4884614,29	7,19	2
	Маскоўскія прысутныя ўстановы	106298,44			45939,97		
4	Вяцкая	1692176,37	4,02	4	2523424,5	3,68	4
5	Казанская	1491059,2	3,55	5	2221999,08	3,24	6
6	Рыжская	1462682,8	3,48	6	1097144,32	1,60	28
7	Курская	1379529,89	3,28	7	2102696,23	3,06	7
8	Тамбоўская	1298234,83	3,09	8	2040749,32	2,97	8
9	Іркуцкая	1289228,99	3,07	9	1746089,49	2,54	12
10	Арлоўская	1189213,6	2,83	10	2269603,09	3,31	5
11	Табольская	1104038,74	2,63	11	1574934,82	2,29	20
12	Цвярская	1099691,18	2,62	12	1909324,64	2,78	9
13	Варонежская	1039114,03	2,47	13	1595206,53	2,32	17
14	Сімбірская	982600,15	2,34	14	1608599,06	2,34	15
15	Уладзімірская	978627,7	2,33	15	1784922,43	2,60	10
16	Яраслаўская	939973,09	2,24	16	1735966,88	2,53	13

Працяг табліцы 4

№	Губерня	1785 г., руб.	%	№ рэйтынгу	1796 г., руб.	%	№ рэйтынгу
17	Ніжагародская	916905,52	2,18	17	1772398,26	2,58	11
18	Валагодская	898733,13	2,14	18	1308734,13	1,91	25
19	Саратаўская	898101,83	2,14	19	1590570,29	2,32	18
20	Разанская	885314,24	2,11	20	1595832,21	2,33	16
21	Тульская	825053,41	1,96	21	1586833,53	2,31	19
22	Наўгародская	806263,32	1,92	22	1467748,35	2,14	22
23	Калужская	798391,77	1,90	23	1443504,62	2,10	23
24	Пензенская	793611,31	1,89	24	1352464,51	1,97	24
25	Кастрамская	771481,17	1,84	25	1621133,04	2,36	14
26	Уфімская	761989,58	1,81	26	1196664,12	1,74	26
27	Смаленская	687769,9	1,64	27	1513339,41	2,21	21
28	Пскоўская	617850,2	1,47	28	1116238,69	1,63	27
29	Архангельская	585211,15	1,39	29	747361,77	1,09	32
30	Астраханская	583617,75	1,39	30			
31	Харкаўская	572903	1,36	31	742183,98	1,08	33
32	Екацярынаслаўская	499692,69	1,19	32			
33	Кіеўская	437877,53	1,04	33	610534,27	0,89	36
34	Аланецкая	432221,39	1,03	34	705205,82	1,03	34
35	***Магілёўская***	414188,64	***0,98***	***35***	556009,31	***0,81***	***38***
36	Чарнігаўская	386196,44	0,92	36	541988,78	0,79	39

Заканчэнне табліцы 4

№	Губерня	1785 г., руб.	%	№ рэйтынгу	1796 г., руб.	%	№ рэйтынгу
37	Ноўгарад-Северская	354083,14	0,84	37	432366,97	0,63	43
38	Калыванская	345636,98	0,82	38	642357,78	0,94	35
39	***Полацкая***	291643,05	***0,69***	***39***	473903,87	***0,69***	***41***
40	Рэвельская	193061,66	0,46	40	407142,7	0,59	44
41	Выбаргская	167223,16	0,40	41	187981,82	0,27	45
42	Каўказская				1083018,43	1,58	29
43	***Мінская***				596952,96	***0,87***	***37***
44–45	***Віленская і Слонімская***				859468,03	***1,25***	***31***
46	Курляндская				460814,15	0,67	42
47–48	Валынская і Падольская				952448,63	1,39	30
49	Брацлаўская				488385,56	0,71	40
50	Войска Данское				19401,52	0,03	46
	Разам	42012142,11	100	41	68597459,87	100	46

Арлоўская і Тамбоўская губерні, найменшыя – Выбаргская, Рэвельская, Наварасійская, Кіеўская (па асобных губернях даныя адсутнічаюць) [4, с. 234–241]. Прыведзеныя ў табліцы 4 звесткі дазваляюць зрабіць выснову, што ў 1785 годзе з 41 губерні Расійскай імперыі лідарамі ў паступленні даходаў выступалі Санкт-Пецярбургская, Пермская, Маскоўская, Вяцкая і Казанская губерні, аўтсайдэрамі – Ноўгарад-Северская, Калыванская, Полацкая, Рэвельская і Выбаргская губерні. У 1796 годзе з 46 губерній і абласцей Расіі да ранейшых высокадаходных (Санкт-Пецярбургская, Маскоўская, Пермская, Вяцкая, Казанская губерні) далучылася Арлоўская губерня, а найменшыя прыбыткі мелі Полацкая, Курляндская, Ноўгарад-Северская, Рэвельская, Выбаргская губерні і вобласць войска Данскога.

Па ўзроўню прыбыткаў беларускія губерні адносіліся да групы найменш даходных губерняў. У 1785 годзе даход Магілёўскай і Полацкай губерняў складаў толькі 1,67 % сярод 41 губерні, у 1796 годзе – 1,5 % з 46. У 1796 годзе агульны даход Магілёўскай, Полацкай, Мінскай, Віленскай і Слонімскай губерній (2486334,17 руб.) складаў толькі 3,62 % агульнага валавога даходу агульнаімперскага казначэйства. У цэлым большая частка сабраных сродкаў, за выключэннем асобных гадоў, выдаткоўвалася на мясцовыя расходы ці залічвалася ў кошт агульнадзяржаўнага казначэйства на выкананне выдаткаў у губернях. Беларускія губерні не іграліістотнай ролі і не сталі донарам у папаўненні сумаў імперскага агульнадзяржаўнага казначэйства.

З прыведзенага вышэй вынікае, што працэс вызначэння агульных маштабаў збораў з новадалучаных да Расійскай імперыі беларускіх земляў ускладняецца наступнымі акалічнасцямі:

- розніцай у курсах абарачэння грошай;
- заменай часткі грашовых збораў натуральнымі, але ў грашовым вылічэнні;
- разнаведамасным улікам і паступленнямі падаткаў і збораў.

У 1781–1796 гадах па ўзроўню грашовых спагнанняў у даходную частку агульнагубернскіх валавых збораў беларускія (Полацкае і Магілёўскае) намесніцтвы займалі даволі сціплае месца (ад 1,4 да 1,8 % агульнарасійскіх збораў, землі Беларусі і Літвы ў цэлым – 3,6 %), што тлумачыцца неабходнасцю паступовага прыстасавання Усходняй Беларусі да агульнарасійскай падатковай і фінансавых сістэм, неплацежаздольнасцю большасці мясцовага насельніцтва.

Інтэнсіўнасць паступленняў часткі даходаў Полацкай і Магілёўскай губерняў у агульнаімперскі дзяржаўны скарб павялічвалася ў час войнаў Расійскай імперыі з Швецыяй, Турцыяй, верагоднага ўзброенага сутыкнення з Прусіяй пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай. З пэўнай доляй верагоднасці можна заключыць, што беларускія землі ў часы кіравання Кацярыны II не сталі донарам цэнтральнага дзяржаўнага казначэйства.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Анищенко, Е. К.* В когтях двуглавого орла: Беларусь во времена Екатерины II (1772–1796 гг.): монография / Е. К. Анищенко. – 2-е изд., доп. – Минск: Изд. В. Хурсик, 2016. – 442 с.

2. Екатерина II: pro et contra / сост., прим., вступ. ст. С. Н. Искюля. – СПб.: РХГА, 2006. – 1064 с.

3. Извлечение из ведомости за 1773 г. // Сборник сведений и материалов по ведомству Министерства финансов. – 1867. – Т. 1, № 3; Т. 5.

4. *Куломзин, А. Н.* Государственные доходы и расходы в царствование императрицы Екатерины II / А. Н. Куломзин // Сборник императорского Русского исторического общества. – СПб.: Тип. Импер. Акад. наук, 1870. – Т. 5. – С. 219–294.

5. *Куломзин, А. Н.* Государственные доходы и расходы в царствование императрицы Екатерины II / А. Н. Куломзин // Сборник императорского Русского исторического общества. – СПб.: Тип. Импер. Акад. наук, 1871. – Т. 6. – С. 219–304.

6. *Куломзин, А.* Финансовое управление в царствование Екатерины II / А. Куломзин // Юридический вестник. – 1869. – № 2. – С. 3–28; № 3. – С. 3–38.

7. *Куломзин, А. Н.* Финансовые документы царствования императрицы Екатерины II / А. Н. Куломзин // Сборник императорского Русского исторического общества. – СПб.: Тип. В. Безобразова и К^0, 1880. – Т. 28. – XXXIV, 490 с.

8. *Мадариага, И.* Россия в эпоху Екатерины Великой / И. Мадариага; пер. с англ. Н. Л. Лужецкой. – М.: Новое лит. обозрение, 2002. – 976 с.

9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі – Фонд 2567. – Воп. 1. – Спр. 264.

10. О расписании доходов в новоприобретенных от Польши губерниях: сенатский указ 5.02.1774 г. // Полное собрание законов Российской империи: собрание 1-е с 1649 по 12 декабря 1825 г.: в 45 т. – СПб.: Тип. 2-го отд-ния собствен. его императорского величества канцелярии, 1830. – Т. 19, № 14119. – С. 909–910.

11. *Чечулин, Н. Д.* Очерки по истории русских финансов в царствование Екатерины II / Н. Д. Чечулин. – СПб.: Сенат. тип., 1906. – II, II, 380 с.

(Дата паступлення: 22.09.2017).